Зіновій Прыгодзіч

НА ЧЫМ ТРЫМАЕЦЦА ЖЫЦЦЁ

Алесь Жук, Зіновій Прыгодзіч і Валянцін Блакіт

З Алесем Жуком мы жылі ў адным доме. Нашы пад'езды былі побач. І вельмі часта, выходзячы з дома, я заўважаў на лаўцы суседняга пад'езда самотную постаць майго сябра. Апошнія гады хворыя ногі не дазвалялі Алесю далёка адыходзіцца, таму ён звычайна прысаджваўся на лаўцы ў двары і думаў нейкую сваю думу. Я не мог прайсці міма, прысуседжваўся да яго. Нам было пра што гаварыць. Эрудыцыя і неспатольная цікавасць Алеся да самых розных праяў жыцця заўсёды ўражвалі і здзіўлялі мяне. І калі толькі ён паспяваў за ўсім сачыць: за вірлівымі палітычнымі падзеямі, за літаратурнымі навінкамі, за нечаканымі зменамі ў жыцці нашых агульных знаёмых.

Гэтак, седзячы на лаўцы, мы маглі прагаварыць і паўгадзіны, і добрую гадзіну. І гэта не было пустой балбатнёй, пераліваннем з пустога ў парожняе. Думкі, развагі Алеся заўсёды тычыліся самага важнага, самага актуальнага, а яго ацэнкі тых ці іншых падзей, тых ці іншых асоб вызначаліся грунтоўнасцю і аб'ектыўнасцю, і мне было не толькі цікава, але і карысна зверыцца з імі.

Пазней, калі з-за хваробы Алесю ўжо было цяжкавата нават выходзіць у двор, ён запрашаў мяне да сябе ў кватэру. Тут звычайна я заставаў яшчэ і яго бліжэйшых сяброў — Яўгена Лецку і Валодзю Ягоўдзіка. За кубачкам гарбаты альбо кавы, а часам (не без таго!) і чаркай больш моцных напояў мы адводзілі душу. Якое ж гэта было раскошна-прыемнае, незабыўнае сумоўе!

Аднак здароўе Алеся ў апошні год пагоршылася, і ён не мог ужо дазволіць сабе нават гэтага. І мы гаварылі па тэлефоне. Адчувалася, што ён пакутуе ад адзіноты, яму не хапае сяброўскай падтрымкі. Адчувалася па тым, што ён не спяшаўся скончыць размову, а на заканчэнне звычайна казаў: «Не знікай, звані часцей...»

Памятаецца наша апошняя размова. Алесь пачаў нешта расказваць, але невыразна, глытаючы канчаткі слоў, і я стаў перапытваць, і раз, і другі... Тады Алесь кажа:

— Пачакай, я зараз устаўлю свае новыя зубы...

Праз нейкі момант чую яго даволі бадзёры голас:

— Ну як?

— О, цяпер выдатна!

І мы ад душы пасмяяліся. І гэты іранічна-вясёлы смех абнадзеіў мяне, што не ўсё так кепска, што Алесь яшчэ пажыве. На жаль, літаральна праз некалькі тыдняў, 15 кастрычніка 2022 года, майго вернага, шчырага сябра, выдатнага пісьменніка не стала.

Яшчэ пры жыцці Алеся Жука я напісаў прадмову да яго двухтомніка выбраных твораў. Артыкул яму спадабаўся, і ён пры выпадку кожны раз мне пра гэта казаў. Таму я дазволю сабе асобныя мясціны з гэтага артыкула тут нагадаць.

...Першыя спробы даверыць свае пачуцці, свае запаветныя думкі чыстаму аркушу паперы ім былі зроблены досыць рана, яшчэ ў восьмым — дзявятым класах. Але ці то прыродная сялянская сарамлівасць, ці то падсвядомае разуменне, што гэта пакуль яшчэ не тое, стрымлівалі юнака ад таго, каб напісанае хутчэй пасылаць у рэдакцыі, аддаваць на суд чужых людзей. Толькі пасля заканчэння сярэдняй школы, у чэрвені 1965 года, у слуцкай «раёнцы» была надрукавана першая навела А. Жука «Яны жывуць...».

Ужо ў першых сваіх публікацыях малады пісьменнік паказаў добрую назіральнасць, тонкае разуменне чалавечай душы і някепскае для пачаткоўца ўменне перадаць убачанае праз слова. Прататыпамі ягоных герояў былі людзі блізкія і добра яму знаёмыя — жыхары вёскі Клешаў, дзе пісьменнік нарадзіўся і вырас, Дзюдзева, куды ён хадзіў у школу, Мусічаў, у якіх працаваў начальнікам паштовага аддзялення бацька.

Родная Случчына з першых крокаў стане для таленавітага пісьменніка невычэрпнай крыніцай творчага натхнення. Тут, у рэальных жыццёвых калізіях, народзяцца сюжэты большасці ягоных аповесцяў, тут, на гэтай зямлі, будуць падгледжаны яркія, каларытныя вобразы лепшых яго навел, тут аднойчы і назаўжды душа зачаруецца непаўторнымі краявідамі.

Студэнцкія гады сталі для А. Жука гадамі напружанай і даволі плённай літаратурнай працы. Выкройваючы час ад заняткаў, прыхопліваючы выхадныя дні, ён натхнёна аддаецца творчасці. У рэспубліканскім друку адно за адным публікуюцца апавяданні «Сок манга», «Завулак», «Водсветы зорак», «Белы месяц», «Мужчыны» і шэраг іншых. Пазней усе яны склалі аснову яго першай кніжкі «Асеннія халады», што выйшла ў 1972 годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура».

Кніжка была сустрэта надзвычай прыхільна. Адным з першых Алеся Жука заўважыў і блаславіў у добры шлях Янка Брыль. Ён жа выказаў меркаванне, што беларуская літаратура мае немалыя падставы звязваць з гэтым імем свае лепшыя надзеі.

Ці спраўдзіліся тыя надзеі, якія ўскладвалі на Алеся Жука на самым пачатку яго творчасці? Думаю, спраўдзіліся ў поўнай меры. Перачытваючы сёння ягоныя творы, мы пераконваемся, што ў асобе А. Жука маем сур'ёзнага і ўдумлівага пісьменніка, які заслужана карыстаўся прызнаннем, папулярнасцю не толькі ў нашага, беларускага, але і ўсесаюзнага чытача. Устойлівасць гэтай папулярнасці мне бачыцца перш за ўсё ў тым, што празаік заўсёды пісаў толькі пра тое, што добра, у дэталях, ведаў сам, што яго глыбока хвалявала. Пры

гэтым канкрэтнасць, у добрым сэнсе слова заземленасць аповеду арганічна спалучаюцца з гаворкаю пра самае істотнае ў чалавечым і грамадскім жыцці.

А. Жук імкнуўся асэнсоўваць каштоўнасці народнай маралі, выяўляць сувязі чалавека з грамадствам, даследаваць духоўны свет асобы. Характэрным у гэтых адносінах з'яўляецца адно з самых ранніх апавяданняў пісьменніка «Асеннія халады».

...Старая Антосіха пражыла доўгае і нялёгкае жыццё. Гаспадар яе памёр пасля мікалаеўскае вайны — прастудзіўся ў акопах, захварэў, паўтара года праляжаў у шпіталі, з паўгода дома, але так і не акрыяў. Засталася адна з дзецьмі — старэйшым сынам Андрэем і маладзейшым Петрыкам. Начаўплася, нагаравалася яна, пакуль сыны падраслі, сталі зарабляць сабе на хлеб. А тут новая бяда — пачалася вайна. Вайна, якая чорным колам праехала па лёсе Антосіхі. Загінуў у партызанах яе малодшы Пятрок. Андрэй жа злёгся з паліцаямі, бадзяўся па вёсках, здзекаваўся з людзей. Пасля вайны яго засудзілі на дваццаць гадоў. Вярнуўшыся з турмы, спрабаваў быў зайсці да маці, але Антосіха не адчыніла дзвярэй, не пусціла ў хату. І грошы, якія ён пазней перасылаў па пошце, адпраўляла назад...

Адзінокая, няшчасная жанчына? Не, такой Антосіха зусім сябе не адчувае. Жыццё сваё яна пражыла хоць і цяжка, але сумленна, шчыра, з высокай годнасцю. Чым магла дапамагала людзям, сэрцам адгукалася на чужую бяду, і людзі за гэта плацілі ёй дабром — любілі і шанавалі.

Лепшыя творы А. Жука сведчаць пра тое, што поспех спадарожнічае пісьменніку часцей за ўсё там, дзе ён малюе народныя характары, асобныя чалавечыя лёсы паказвае цесна знітаванымі з канкрэтнымі абставінамі жыцця, неадлучнымі ад гісторыі і народнай маралі.

Найбольш глыбока, псіхалагічна і па-мастацку пераканаўча гэтыя прынцыпы ўвасоблены ў аповесці «Халодная птушка», якую многія крытыкі прызналі не толькі асабістай удачай аўтара, але і значным дасягненнем усёй нашай так званай вясковай прозы. Аповесць па сваёй тэматыцы, па светаадчуванні і разуменні галоўных жыццёвых каштоўнасцяў герояў блізкая да «Асенніх халадоў». У цэнтры — тая ж старая вясковая жанчына, на якую ўвесь час абрыньваліся шматлікія нягоды і суровыя выпрабаванні. Але яна не зламалася пад іх цяжарам, не ўпала духам. Цяжка было — цярпела, білася з усіх сіл, каб выжыць, застацца чалавекам. І вось гэтыя якасці — нязломнасць духу, самаахвярнасць, духоўная шчодрасць і дабрыня — і робяць Анэту па-чалавечы прывабнай, ставяць яе на тую маральную вышыню, з якой добра бачыцца сутнасць астатніх персанажаў твора.

Быць чалавекам, застацца ім у самых складаных абставінах і пакінуць свет з годнасцю, са спакойнай душой — вось тая філасофская і маральная максіма, якую ставіць А. Жук літаральна перад кожным са сваіх герояў, на якой правярае яго чалавечую сутнасць. Не кожны вытрымлівае гэты суровы экзамен.

Ян Кулеш, галоўны персанаж з аповесці «Праклятая любоў», — фігура складаная і супярэчлівая. З аднаго боку, гэта не Кіршчэня — гультай і латруга, які вельмі рана прызвычаіўся спекуляваць на высокіх ідэях і дзеля таго, каб есці лёгкі хлеб, гатовы бяздумна выконваць любую дырэктыву. Не, Кулеш — чалавек працавіты, гаспадарлівы. Хоць жыццё і не песціла яго, круціла, як тую

салому ў малатарні, але ніякія перабудовы вёскі — сацыяльныя патрасенні — не змаглі заглушыць у ім хлебаробскай жылкі.

А з другога боку, няма ў Яна таго душэўнага спакою, таго адчування паўнаты жыцця, той моцы і праваты, якія складаюць аснову светаўспрымання старой Антосіхі і Анэты. Балючае празрэнне прыходзіць да яго на жыццёвым перавале: «...Што толку з таго, што пайшоў на трактарыста, што зарабляў увесь век? Аказваецца, шчасце не заробіш. Шчасце быццам ад Бога: альбо ўдаецца, альбо не. Гэта як каму пашанцуе».

Куляшу не пашанцавала. Маладосць у яго забрала вайна, з якой вярнуўся «пабіты, ледзь душа ў целе». Затым былі гады, калі даводзілася, ірвучы жылы, ажыццяўляць нечыя дурныя ідэі — узбуйняць, руйнаваць, узнаўляць. І ўдзень, і ўначы працаваць «для нечага іншага, лепшага, толькі не для самога сябе». Вельмі шмат знаходзілася тады ахвотнікаў думаць за чалавека, не пытаючыся яго згоды, рыхтаваць яму «светлую будучыню». А ў выніку — чалавек гэты аказаўся ля разбітага карыта.

Ужо пры самай старасці, здавалася б, усміхнулася яму даўно жаданае шчасце — прыйшло да яго пакутлівае запозненае каханне. Але і тут злыя языкі пляткараць, дазнаецца пра яго любоў жонка, піша скаргу ў райкам партыі. Ад перажыванняў дае знаць старая кантузія. Ён слепне.

Аповесць заканчваецца драматычна. Няпэўнасць і пустата на душы ў героя. А яго слепата сімвалізуе слепату не толькі фізічную. І разам з Янам, а недзе, можа, ужо трошкі і за яго, мы дадумваемся да важнай і простай, як само жыццё, ісціны: якімі б складанымі ні былі абставіны, многае залежыць і ад самога чалавека, і трэба заўсёды відушчымі вачыма глядзець на свет і на людзей.

Несумненна, А. Жуку лепш за ўсё ўдаваліся характары вясковых людзей. Народны тыпаж цікавіць пісьменніка, пачынаючы з першых яго апавяданняў. Але гэта цікавасць — не самамэта. Праз характэрныя рысы, паводзіны, дзеянні чалавека А. Жук імкнецца раскрыць істотныя праявы рэчаіснасці, агульназначныя тэндэнцыі развіцця грамадства. Усюды адчуваецца клопат пра чалавека душэўнага, сумленнага, чалавека, які цвёрда ведае сваё чалавечае прызначэнне ў свеце, і разам з тым амаль у кожным творы прысутнічае рашучае адмаўленне бездухоўнасці, меркантыльна-спажывецкіх адносін да жыцця, хцівасці і сквапнасці, мяшчанства ва ўсіх яго праяўленнях.

Меркантыльныя, спажывецкія адносіны да жыцця, адрыў ад родных каранёў, сцвярджае А. Жук, непазбежна прыводзяць да крайняга эгаізму, а то і да маральнага здзічэння, адкрытай нялюдскасці. Менавіта такая гісторыя адбылася з галоўным героем аповесці «Чыгун», некаторымі персанажамі іншых твораў, аб'яднаных агульнаю назвай «Праклятая любоў».

Паказваючы сучаснага абывацеля, шлях, які прыводзіць да гэтага, адсутнасць духоўнасці як галоўную прычыну перараджэння чалавека-творцы ў чалавека-спажыўца, А. Жук нідзе не імкнецца да нейкай выдзеленасці гэтай з'явы ці гэтых фактаў, да сатырычнага завастрэння ў яе паказе. Усё падаецца як самае звычайнае жыццё, у якім чалавек дзесьці губляе духоўныя крытэрыі, духоўныя арыенціры і становіцца мешчанінам, для якога галоўнае, каб у яго было ўсё, як у іншых.

Героі аповесці «Такая восень» — настаўнікі, і, здавалася б, ужо само асяроддзе, само высокае прызначэнне прафесіі — сеяць разумнае, добрае,

вечнае — павінна было б тых, хто абраў сабе гэту прафесію, аберагчы іх ад бездухоўнасці, ад нявыхаванасці. На жаль... Дырэктар школы Васіль Аляксеевіч з тых людзей, для каго асабістае заўсёды было на першым плане. Крочыў ён па жыцці лёгка, засвоіўшы простую ісціну: вырывацца наперад — небяспечна, а плесціся ў хвасце — пяткі адтопчуць. Яшчэ далей пайшоў па гэтай хісткай сцежцы яго духоўны пераемнік Аляксандр Пятровіч. Пачаўшы з нявіннай бесклапотнасці, нежадання асабліва высільвацца на рабоце, пошуку прыемных забаў, ён скаціўся да абыякавасці і прыстасаванства, да непераборлівасці ў сродках.

Пісьменнік катэгарычна не прымае такіх вось вузкамеркантыльных адносін да чалавека. Больш шырока гэта тэма гучыць у аповесці «Не забывай мяне». Яркімі, бязлітаснымі штрыхамі намаляваны тут вобраз Дворніка. Яго адкрыта недалюблівалі калегі, бо апошнім часам той стаў «чалавекам, які найбольш шанаваў сваё начальства. Уголас і дзе трэба, і не трэба расхвальваў яго, да таго, што ўрэшце і само начальства старалася абыходзіць Дворніка, але калі трэба было даведацца, што робіцца ў аддзеле, то начальства выклікала да сябе Дворніка...»

Так, мяшчанства шматаблічнае і шматколернае. А. Жук умее ўбачыць і перадаць розныя яго праявы і адценні. Пры гэтым ён паказвае, што сапраўднае шчасце на такім хісткім і няпэўным грунце пабудаваць немагчыма.

Сімвалічным мне бачыцца назва апавядання «Пагарэльцы». Усё жыццё прагны да работы Віцічак збіраў грошы: свіней трымаў, бычкоў гадаваў, гусей, качак... Пабудаваўся сам, дзецям дачы паставіў, машыны памог купіць. І вось у адзін момант усё пайшло прахам. Зяць злёгся з жонкаю сына, селі на «Волгу» і паехалі! Можна толькі паспачуваць састарэлым бацькам у іхняй бядзе і адчаі. «Усю жызню будаваўся, а цяпер на галавешках сядзім. Пагарэльцы».

Шчасце, сэнс жыцця... Па-рознаму вырашаюць гэтыя адвечныя пытанні героі твораў А. Жука. Хто бачыць сваю мэту ў матэрыяльным дабрабыце, а хто, наадварот, свядома ігнаруючы сініцу, якая сама ідзе ў рукі, усё жыццё марыць пра няўлоўнага жураўля ў небе. А той-сёй і зусім не задумваецца над гэтымі праблемамі, марнуе свае дні на нікчэмнае і пустое. І часам трэба перажыць сур'ёзнае патрасенне, як перажыў яго, скажам, Праташчык (апавяданне «Вечаровае сонца»), на вачах у якога загінуў лейтэнант Весялюк, каб зразумець усю «кароткасць чалавечага жыцця, што яно адно і непаўторнае і што трэба жыць шчасліва ў суладдзі з радасцю». І тады абуджаецца ў душы свядомая прага жыцця, каб толькі бачыць і адчуваць жыццё, і гэта ўжо шчасце: халаднаваты сум восеньскага дажджу, сіняваты сакавіцкі водсвет на снезе, душнаваты подых летняга ветрыку, лёгкі зімовы похрумст лядку пад коламі машыны і проста гаворка з людзьмі, вясёлымі і жывымі.

У кантэксце гэтых разважанняў нельга абмінуць увагаю аповесць «Паляванне на Апошняга Жураўля». Аповесць, у якой, на мой погляд, аўтарская ідэя — ідэя бескарыслівага служэння людзям, шчырай і шчодрай дабраты — гучыць асабліва завострана і эмацыянальна. У творы надзвычай моцна выяўляецца пачуццё гневу і пратэсту супраць спажывецкіх, браканьерскіх адносін як да прыроды, так і да прынцыпаў сумленнага жыцця на роднай зямлі.

Сцяпану Дзямідчыку, здавалася, ужо можна было б і дажываць свой век спакойна: ён сваё сумленна адпрацаваў, дзяцей пагадаваў, раскашуй сабе на пенсіі ды кожнаму новаму дню радуйся. А яму да ўсяго справа. І са старшынёй

уступіць у спрэчку, бо не ў пару вывелі на поле камбайны, і з вяскоўцамі счэпіцца, якія раскрадаюць калгаснае дабро, браканьернічаюць на зайцоў і баброў, і нават з жонкаю пасварыцца з-за таго, што многага яна не можа ўцяміць, усё наравіць высмеяць яго, спыніць.

На адной з чытацкіх канферэнцый у Ганцавіцкім раёне настаўніца В. Халецкая ўсхвалявана гаварыла:

— Я часта хаджу з дзецьмі на экскурсіі, і яны пытаюцца, чаму ў бяроз, у самы разгар вясны, лісце раптам становіцца жоўтае, як абпаленае? Чаму ў нас лебедзі толькі тры дні былі? На ўсе гэтыя «чаму» мы павінны шукаць адказ. Наш век — век барацьбы за чалавечыя душы. І калі мы выгадуем самазаспакоеных людзей, якія не берагуць, не песцяць зямлю, гэта будзе злачынствам перад будучыняй. Сэнс аповесці «Паляванне на Апошняга Жураўля» ў тым і заключаецца, каб памагаць чалавеку быць чалавекам!

Добра сказана. А мне здаецца, гэтыя словы можна было б паставіць своеасаблівым эпіграфам і да ўсёй творчасці пісьменніка. Бо аб чым бы ні пісаў Алесь Жук — пра цяжкія, пакручастыя людскія лёсы, пра ваеннае ліхалецце, пра светлыя і ўзвышальныя імгненні кахання — усюды ў цэнтры ўвагі чалавечая душа, духоўны свет асобы. Чалавек народжаны для доўгага і шчаслівага жыцця — у гэтым перакананы многія Жукавы героі і сам аўтар. Адпушчанага веку зусім дастаткова, каб кожны з нас мог праявіць сябе, сваю сапраўдную чалавечую сутнасць у якой-небудзь вялікай і значнай справе. Важна толькі чэсна і сумленна прайсці наканаваную дарогу, не ачарсцвець сэрцам, не страціць кроўнай сувязі з прыродай і светам людзей. Якраз гэтай мераю — мераю высокай духоўнасці, чалавечнасці — вывярае пісьменнік сутнасць сваіх герояў.

Нехта з вялікіх сказаў: каб стаць сапраўдным пісьменнікам, трэба мець, прынамсі, тры рэчы — веды, сэрца і майстэрства. Як мы пераконваемся сёння, усім гэтым Алесь Жук валодаў у дастатковай ступені. Выдатны празаік, ён не толькі «працягваў распрацоўваць жанр чэхаўскай інтэлектуальнай навелы» (М. Лобан), але і паспяхова развіваў у сваіх аповесцях літаратурныя традыцыі, закладзеныя Я. Коласам, К. Чорным, Я. Брылём.

Алесь Жук выдатна разумеў сваю пісьменніцкую місію. Уступіўшы ў пару літаратурнай сталасці, ён прызнаваўся, што пачынаеш ужо быць больш строгім да сябе і больш стрыманым у пачуццях і ведаеш ужо дарагую цану цудоўнаму, і ці не тады пачынаюць даймаць мастака думкі пра тое, каб расказаць не пра асобнага чалавека, а пра ўвесь свой народ, сваю Бацькаўшчыну, свой час.

...Выходжу з дома і па звычцы шукаю вачыма знаёмую постаць на лаўцы суседняга пад'езда. А яе — няма. І скрушна, самотна становіцца на душы: яшчэ адным сябрам паменела. Суцяшае іншае, больш істотнае. Тое, што постаць Алеся Жука засталася ў нашай літаратуры. І, думаецца, застанецца назаўсёды. Бо яго творы — пра тыя вечныя (духоўныя, маральныя) каштоўнасці, на якіх трымаецца наша жыццё.